# § 5. Вялікая грэчаская каланізацыя

?! **1.** Што такое калонія? **2.** Які старажытны народ заснаваў калоніі на ўзбярэжжы Міжземнага мора? Для чаго гэта было зроблена?

У VIII—VI ст. да н. э. старажытныя грэкі рассяляліся па берагах Міжземнага і Чорнага мораў. Перасяленне грэкаў і стварэнне паселішчаў (калоній) на чужых землях назвалі Вялікай грэчаскай каланізацыяй. У чым заключаюцца прычыны, цяжкасці і значэнне грэчаскай каланізацыі?

**1. Прычыны каланізацыі.** Прычыны перасялення грэкаў былі рознымі. Але асноўная — адна. У Грэцыі рэзка павялічылася колькасць жыхароў. Частка грэкаў ужо не магла пракарміцца на радзіме. Умовы жыцця станавіліся ўсё горшымі і горшымі. А свабодных зямель у гарыстай Грэцыі і на астравах не было. Выхадам мог быць толькі пошук прыдатных зямель на чужыне.




▲ Прычыны грэчаскай каланізацыі

*З дапамогай схемы і тэксту параграфа растлумачце, чаму грэкі пакідалі радзіму і ад'язджалі ў далёкія краіны.*

с. 199–200

**2. Заснаванне калоній у Міжземнамор'і і Прычарнамор'і.** Перасяленне насіла арганізаваны характар. Улады поліса праводзілі разведвальныя экспедыцыі, прызначалі адказных асоб за арганізацыю ад'езду пасяленцаў і асваенне новых зямель.

Перад далёкай дарогай будучыя каланісты наведвалі Дэльфійскі храм. Калі прадказанні багоў былі неспрыяльнымі,



Правообладатель Народная асвета




Тэрыторыя Грэцыі да VIII ст. да н. э.

Асноўныя напрамкі грэчаскай каланізацыі

Калоніі грэкаў
- найбуйнейшыя
- іншыя

Мілет — Грэчаскія гарады, якія заснавалі значную колькасць калоній

Грэчаская каланізацыя

*Выкарыстоўваючы карту, складзіце ў сшытку схему «Асноўныя напрамкі грэчаскай каланізацыі».*

то ад’езд пераносіўся. Калі жыццё на новым месцы складвалася добра, дэлегацыя каланістаў наведвала былы родны горад з багатымі дарункамі.

Каланісты, звычайна жыхары з аднаго горада, перасяляліся групамі па 100—200 чалавек. Яны везлі з сабой жывёлу, зброю, насенне, жменю зямлі сваёй айчыны і агонь. На шляху да новай радзімы іх чакала шмат небяспек — буры, хваробы, голад і холад, марскія разбойнікі — піраты.


Правообладатель Народная асвета

Але вось усе нягоды падарожжа мінулі. Перасяленцы выбіралі зручнае месца каля гавані або ў вусці ракі, на ўзвышэнні. Высыпалі пад ногі зямлю, прывезеную з радзімы. На ёй раскладалі вогнішча, падпальваючы яго ад агню, які старанна ахоўвалі ў час свайго падарожжа. Пасля гэтага прыносілі ахвяру багам у знак падзякі і з надзеяй на будучыню. Затым дзялілі зямлю на роўныя ўчасткі пад раллю і для выпасу жывёлы. Будавалі храмы і жыллё. Горад акружалі сценамі. Уладкаваўшыся, перавозілі жанчын, дзяцей і старых. Так пачыналася новае жыццё на новым месцы.




Гандаль калоній і метраполій

*Падумайце, каму і чаму было выгадна стварэнне калоній.*

Грэкі-каланісты не парывалі сувязей з родным горадам, з якога прыплылі. Яны называлі яго *метраполіяй* — горадам-маці. Калі каланіст вяртаўся на радзіму, ён надзяляўся ўсімі правамі грамадзяніна. У той жа час новыя гарады былі зусім незалежныя ад метраполій.



Найбуйнейшай метраполіяй з’яўлялася горад Мілет у Малой Азіі. Жыхары гэтага горада заснавалі некалькі дзясяткаў калоній. Некалькі калоній заснавалі Афіны і ўсяго адну — Спарта.

Старажытнагрэчаскі гандлёвы карабель



Правообладатель Народная асвета

**3. Грэкі і варвары.** Эліны сустрэліся з народамі, якія адрозніваліся ад іх па мове, звычаях, рэлігіі і культуры. Усіх, хто гаварыў на незразумелай мове, яны называлі *ва́рварамі* («чужаземцамі»). Для грэкаў варварамі былі і персы, і егіпцяне, і жыхары Вавілоніі, не кажучы ўжо пра адсталыя плямёны. Слова «варвар» азначала «чужынец», «не элін». З часам грэкі сталі лічыць толькі сябе лепшымі, дастойнымі, ва ўсім адчувалі перавагу над варварамі, народжанымі для рабства.

**4. Вынікі і гістарычнае значэнне каланізацыі.** Каланізацыя спрыяла развіццю гаспадаркі, гандлю і караблебудавання. Яна пашырала межы старажытнагрэчаскага свету. Эліны спачатку засялілі ўзбярэжжа Паўднёвай Італіі і Сіцыліі, а затым — сучаснай Паўднёвай Францыі і Іспаніі. Заснавалі буйныя калоніі на берагах Чорнага мора, у тым ліку на тэрыторыі сучасных Расіі, Украіны і Грузіі. Аднак, дзе б ні жылі грэкі, яны гаварылі на адной мове, пакланяліся адным багам. Яны заўсёды ўсведамлялі сваё адрозненне ад іншых народаў і прыналежнасць да свету элінаў.

## ПАДВЯДЗЁМ ВЫНІКІ

*✦ У выніку перасялення грэкі заснавалі калоніі на берагах Міжземнага і Чорнага мораў. ✦ Каланізацыя спрыяла ўздыму гаспадарчага жыцця, гандлю і караблебудавання, фарміраванню ў грэкаў пачуцця прыналежнасці да адзінага народа.*

? **1.** Складзіце апавяданне ад асобы каланіста паводле плана: а) прычыны перасялення; б) арганізацыя ад'езду; в) наведванне Дэльфійскага храма; г) цяжкасці падарожжа; д) новае жыццё на новым месцы; е) наведванне метраполіі. **2.** У якіх частках свету грэкі заснавалі калоніі? Як вы думаеце, чаму яны рассяляліся на ўзбярэжжы, а не асвойвалі ўнутраныя раёны мацерыка? **3.** Знайдзіце ў тэксце сказы, якія раскрываюць значэнне Вялікай грэчаскай каланізацыі.


Правообладатель Народная асвета